**Баравая Ірына**

# Памяць сэрца

У мірным шэсці Мядзельскага краю
Пераможна салютуе май...
Ветэрана сёння ўспамінаю –
Гэта мой дзядуля Мікалай...

Жонка і маленькая дачушка
У Навасёлках без гаспадара.
А наўкол баі, гарматы, пушкі,
Кенігзберг, у бой ісці пара.

Там і быў паранены, у полі,
Ды яму пашчасціла, Бог ёсць!
У шпіталі падлячылі Колю,
Беражыся зноў, «нямецкі госць»!

Снілася няскошаная ніўка,
Дровы нешчапаныя ў двары
І садок, і маладая сліўка –
Не прывіў... расце хай да пары.

Добрае жыццё пражыў дзядуля,
Я пішу праз слёзы гэты верш,
У сэрцы памяць пра яго шаную,
Кветкі я яму нясу найперш.

Вецер над Масквой сцягі палошча
У руках у праўнука партрэт
Па маскоўскіх вуліцах і плошчах
Ганарова крочыць яго дзед!

Ён прайшоў вайну: баі, шпіталі
За Радзіму, за бацькоўскі край.
Я хачу, каб усе людзі зналі,
Што герой Смятанка Мікалай!